# «Анёл» апякуе

**Шэраг нядаўніх выставачных праектаў у сталіцы і рэгіёнах прымеркавалі да Міжнароднага дня інвалідаў. Сярод такіх — фотавыстаўка Дар'і Філіповіч «Павер у сябе», якая працуе ў галерэі «Мабільная» Нацыянальнай бібліятэкі да 12 лютага. Праект арганізаваны пры ўдзеле школы фатаграфіі «Анёл» аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Савецкага раёна горада Мінска.**

Як адзначаюць арганізатары, мэта выстаўкі — прыцягнуць увагу да праблемы інваліднасці і жыцця з абмежаванымі магчымасцямі, да таго ж расказаць пра дзейнасць цэнтра і фоташколы «Анёл». Дарэчы, куратарам выступае кіраўнік гэтай школы, член Беларускага грамадскага аб'яднання фатографаў, педагог, інвалід-калясачнік Эдуард Клуйша.

Аўтар выстаўкі Дар'я Філіповіч прадставіла работы, створаныя за год. Назва «Павер у сябе» — і напамін людзям побач, апатычным, сумным, пазбаўленым прагі жыцця, і зварот аўтара да самога сябе — своеасаблівая прапанова ці нават патрабаванне дзейнічаць, нават калі здаецца, што сіл не засталося. Супрацьстаяць абмежаванням, змагацца — значыць знайсці сябе. І Дар'я Філіповіч якраз на такім шляху. Пра гэта сведчыць найперш сама зацікаўленасць мастацтвам фатаграфіі, а таксама звязанае з гэтым вывучэнне працэсу атрымання і захавання выяў. Па-другое, імкненне здымаць: усё ж не кожны, каго прыцягвае гэтае майстэрства, бярэ ў рукі фотаапарат. Ды, у рэшце рэшт, энергія і жаданне аб'яднаць атрыманыя здымкі ў адну выстаўку і прадставіць яе перад шырокай публікай. А да гэтага яшчэ трэба падрыхтавацца: выбраць найбольш прыдатныя здымкі, надрукаваць іх, прыдумаць назву да кожнага, скампанаваць пад адзіным загалоўкам… Ва ўсім гэтым амаль заўсёды адчуваецца імпэт і радасць аўтара ад магчымасці падзяліцца вынікамі сваёй працы.



*«Грушапад».*



*«Прыгажуня Няміга».*



*«Цёплае імгненне».*

Пошук сябе, у якім часта дапамагае творчасць, бачны і па не зусім аднастайнай структуры выстаўкі: тут і партрэты, і нацюрморты, і пейзажы, і нават пара адцягненых сюжэтаў. З іншага боку, гэта добрая магчымасць прадэманстраваць гледачу напрацоўкі і заявіць пра сябе як пра рознабаковага фатографа. Вядома, шанс падзяліцца сваім поглядам на жыццё і навакольны свет нельга ўпускаць.

Арганізатары нагадваюць: «Падобныя праекты падтрымліваюць такіх аўтараў, як Дар'я Філіповіч, дзяцей, маладых і дарослых людзей з інваліднасцю на шляху іх творчай рэалізацыі, сацыялізацыі ў грамадстве, транслююць актыўную жыццёвую пазіцыю, вучаць верыць у сябе і сваё шчасце». Ёсць спадзяванні, што выстаўка, арганізаваная ў Нацыянальнай бібліятэцы, падштурхне аўтара да новых пошукаў і здзяйсненняў, ды наогул дапаможа такім жа фатографам-пачаткоўцам зрабіць упэўненыя крокі да авалодання майстэрствам, якое, безумоўна, прынясе задавальненне.

Фотавыстаўка Дар'і Філіповіч «Павер у сябе» будзе працаваць да 12 лютага.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**